# ПЛАТОН ЦЯСЕВІЧ: АД ВЁСКІ НА НАВАГРУДЧЫНЕ ДА ІМПЕРАТАРСКАГА ТЭАТРА

## Жыццёвы і творчы шлях славутага суайчынніка



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**М. М. Сакалоўская,**
старшы выкладчык Беларускай акадэміі музыкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэарэтыкі псіхааналізу сцвярджаюць: толькі асобе, якая валодае творчай сілай «Я», удаецца стварыць неўміручыя высокамастацкія вобразы. Паводле А. Адлера, індывід сам можа сфаміраваць сваю асобу ў адпаведнасці з уласным унікальным стылем жыцця. «Я» – гэта высокаперсаналізаваная суб'ектыўная сістэма, што выкарыстоўвае вопыт арганізма, з дапамогай якога магчыма з'яўленне ўнікальнага жыццёвага стылю. Калі ён яшчэ адсутнічае ў індывіда, творчая сіла «Я» імкнецца яго стварыць [1]. Такой звышнатуральнай творчай сілай валодаў наш таленавіты суайчыннік Платон Іванавіч Цясевіч.**

### Цясляр, які любіў спяваць

Нарадзіўся П. І. Цясевіч 25 лістапада 1879 г. у вёсцы Нягневічы Навагрудскага павета Гродзенскай губерні ў сям'і рамесніка. Яго бацька быў цесляром і сына з маленства прывучаў да майстэрства апрацоўкі дрэва. Але асаблівага дастатку ў сям'і не было. Бацька вымушаны быў час ад часу выязджаць на заробкі ў Расію і Украіну. А калі Платону споўнілася 10 гадоў, яго сям'я перабралася ў Кіеў на пастаяннае месца жыхарства.



Іван Цясевіч працаваў ад світання да змяркання, маці займалася гаспадаркай, а дзесяцігадовы Платон пачаў наведваць царкоўна-прыходскую школу. Настаўніка спеваў уразіў моцны, гучны, чысты дыскант хлопчыка, і ён расказаў аб прыродных здольнасцях свайго вучня рэгенту хору Сафійскага сабора Яну Сцяпанавічу Калішэўскаму. Праслухаўшы юнага спевака, рэгент вызначыў: «Малайчына, цудоўны голас і вельмі добры музыкант» – і запрасіў хлопчыка ў знакаміты хор Сафійскага сабора [3, с. 45]. Платон аказаўся здольным вучнем. На дзіва хутка ён спасціг нотную грамату, набыў навыкі правільнага гукавядзення. Неўзабаве Ян Сцяпанавіч прызначыў таленавітага вакаліста салістам хору. Платон быў адным з лепшых вучняў у школе. За выдатныя поспехі яго нават перавялі ў гарадское вучылішча. Але закончыць навучанне хлочыку не ўдалося – цяжка захварэла маці, а заробкаў бацькі з Платонам

(як саліст хору ён атрымліваў 20 рублёў у год) ледзь-ледзь хапала на харч і лекі. Матэрыяльнае становішча сям'і вымусіла хлопчыка пакінуць і вучобу, і працу ў хоры. Бацька ўладкаваў сына ў цяслярную майстэрню.



Цяжкая фізічная праца не прыцішыла цікавасці Цясевіча да музычнага мастацтва. Нягледзячы на стомленасць, вечарамі юнак імчаўся ў гарадскі сад, дзе ладзіліся музычныя канцэрты, і слухаў прафесіянальных выканаўцаў да позняй ночы. Час ад часу Платону ўдавалася набыць танны білет у гарадскі оперны тэатр.

Матэрыяльныя цяжкасці прымусілі Івана Якаўлевіча і Марыю Восіпаўну пераехаць з сынам з Кіева ў Екацярынаслаў – у пачатку XX ст. буйны прамысловы і культурны цэнтр. Бацьку з сынам удалося ўладкавацца цеслярамі на металургічны завод. Пазней Платон асвоіў прафесію мадэльшчыка ў ліцейным цэху. За працай хлопец спяваў беларускія песні, якім яго навучылі бацькі. Сталявары цэха ахвотна слухалі задушэўныя народныя напевы ў выкананні мадэльшчыка-беларуса. Даведаўшыся, што ў горадзе існуе рабочы хор, Платон запісаўся туды. Чуткі аб прыгожым барытоне дайшлі да рэгента архірэйскага хору, і Цясевіча запрасілі спяваць у ім. Там Платон зразумеў, што мала мець пастаўлены прыродай голас – неабходна шмат працаваць, прычым пад кіраўніцтвам вопытнага педагога. Маладому спеваку пашанцавала: лёс звёў яго з Й. Левіным, вучнем сусветна вядомага італьянскага спевака і педагога К. Эверардзі. Праслухаўшы Платона, ён пагадзіўся даваць яму ўрокі вакалу. Але сумяшчаць працу ў ліцейным цэху са спевамі было немагчыма, і Платон вырашае пакінуць завод, каб заняцца цалкам творчай дзейнасцю.

## На прафесійнай сцэне

У 1901 г. Цясевіч паступае ў невялікую аперэтачную трупу, антрэпрэнёр якой Ю. Балсуноўскі абяцае яму хуткую і бліскучую артыстычную кар'еру. Праўда, напачатку маладому спеваку даводзілася быць і статыстам, і харыстам, і нават бутафорам. Усе гэтыя абавязкі ён выконваў з радасцю, бездакорна, бо адчуванне сваёй лучнасці з музычным мастацтвам прыносіла радасць і давала сілы. Адначасова Цясевіч напружана працаваў над удасканаленнем уласнага сцэнічнага майстэрства, шліфоўкай свайго голасу. У выніку прыгожы барытон ператварыўся ў бас-кантантэ шырокага дыяпазону.

Малады спявак знаёміцца з рэжысёрам тэатра Украінскай музычнай камедыі М. Крапіўніцкім. Той высока ацэньвае рэдкі па прыгажосці тэмбру бас Цясевіча. У выніку кіраўніцтва тэатра Украінскай музкамедыі заключае ў 1902 г. кантракт са спеваком. Пад кіраўніцтвам рэжысёра і больш вопытных вакалістаў Платон асвойвае сольныя партыі ў аперэце «Назым Хікмет», у класічных операх «Наталка-Палтаўка», «Запарожац за Дунаем». З гэтымі спектаклямі П. Цясевіч пабываў на гастролях у Беларусі, Украіне, Польшчы. У Варшаве наш суайчыннік пазнаёміўся і пасябраваў з такімі знакамітымі майстрамі сцэны, як П. Саксагонскі, М. Садоўскі, якія, паводле меркавання У. Яфрэмава, аказалі «вялікі ўплыў на фарміраванне мастацкіх поглядаў Цясевіча» [2, с. 160]. Вопытныя артысты дапамагалі Платону адпрацоўваць дэталі знешняга малюнка ролі, знаёмілі з сакрэтамі выбару характарнага грыму, вучылі працаваць са словам. Даследчыкі творчасці П. Цясевіча мяркуюць, што менавіта польскія калегі параілі спеваку-беларусу паспрабаваць сябе ў оперы. М. Садоўскі, напрыклад, быў шчырым паклоннікам голасу Цясевіча і часта ўсклікваў: «Ну і голас жа ў цябе, Платон! Табе трэба спяваць у оперы!» [2, с. 161]. А слынны польскі спявак А. Дудар, які выступаў на сцэнах «Ла Скала» і «Метраполітэн-опера», пачуўшы Платона ў ролі Султана ў оперы «Наталка Палтаўка», высока ацаніў прыгажосць голасу Цясевіча, яго натуральную акцёрскую ігру і быў вельмі здзіўлены, калі даведаўся, што той не мае прафесійнай музычнай адукацыі. А. Дудар прапанаваў таленавітаму спеваку сваю дапамогу. Пад кіраўніцтвам вопытнага майстра малодшы калега за кароткі час вывучыў найскладанейшую партыю Мефістофеля ў оперы Ш. Гуно «Фауст».

У 1904 г. Платон Цясевіч падпісаў кантракт з Харкаўскай гарадской операй, і з гэтага часу пачынаецца яго кар'ера опернага спевака. Менавіта тут ён упершыню выканаў на сцэне партыю Мефістофеля. Адной з любімых опер Цясевіча была «Русалка» А. Даргамыжскага, у якой сам ён выконваў партыю Мельніка. Малады артыст з дзівоснай пераканаўчасцю перадаў



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

пачуцці няшчаснага, забытага ўсімі старога чалавека, які аплаквае смерць любімай дачкі. Гледачы былі зачараваныя не толькі прыгожым голасам выканаўцы, але і яго поўнай трагедыйнага накалу акцёрскай ігрой.

### Цясевіч і Шаляпін

Неаднаразова Платону Цясевічу даводзілася выступаць на адной сцэне з Фёдарам Шаляпіным. Так, у красакавіку 1904 г. у Харкаве ў спектаклі «Барыс Гадуноў» партыю Гадунова выконваў Шаляпін, а партыю Пімена – Цясевіч. З гэтай першай сустрэчы двух вялікіх спевакоў пачалася іх сумесная творчасць і шчырае сяброўства. Як прызнаваўся сам Платон Іванавіч, у Фёдара Іванавіча ён вучыўся сцэнічнаму майстэрству, але ніколі не капіраваў вялікага спевака. Ф. Шаляпін і П. Цясевіч неаднаразова выконвалі партыі дона Базіліа ў оперы «Севільскі цырульнік». Але калі ў Шаляпіна персанаж гэты нагадваў нахабнага праныру, то ў Цясевіча – хітраватага прастачка. У 1925 г. спевакі пабывалі ў еўрапейскіх краінах з сумеснымі гастролямі. Па чарзе яны спявалі вядучыя партыі ў операх «Барыс Гадуноў», «Дон Карлас», «Князь Ігар», «Севільскі цырульнік», «Русалка», «Хаваншчына». Трыумфам для Платона Цясевіча стала яго выступленне ў славутым міланскім тэатры «Ла Скала» ў ролі цара Барыса ў оперы «Барыс Гадуноў». Італьянская прэса была перапоўнена хвалебнымі водзывамі аб майстэрстве спевака, аб рускай вакальнай школе. Газеты пісалі, што голас Цясевіча вылучаецца шырынёй і мяккасцю, яркай сілай гучання, якая часам нават перакрывала аркестр. Антрэпрэнёры многіх еўрапейскіх тэатраў імкнуліся заключыць з артыстам кантракт, прапаноўвалі велізарныя ганарары, але наш суайчыннік не захацеў пакідаць радзіму. У 1932 г. Ф. Шаляпін і П. Цясевіч у апошні раз сустрэліся на адной сцэне – у парыжскай «Апера-Камік» на адкрыцці сезона Рускай оперы. У спектаклі «Князь Ігар» абодва басы выконвалі цэнтральныя ролі: Шаляпін – партыю Уладзміра Галіцкага, Цясевіч – партыю Канчака.

Сучаснікі вялікіх артыстаў адзначалі іх нават знешняе падабенства: абодва высокія, амаль аднаго ўзросту, з высакароднымі манерамі, вельмі артыстычныя. Здаралася, нашага земляка называлі другім Шаляпіным. На гэта Платон Іванавіч сур'ёзна адказваў: «Я не другі Шаляпін, а першы Цясевіч!». І гэта была праўда. Вядомы кампазітар і крытык Ю. Сахноўскі адзначаў, што Платон Цясевіч ні на ёту не капіруе Шаляпіна, які «наклаў кляймо на выкананне басавых партый». Усё жыццё Платон Іванавіч лічыў Шаляпіна сваім настаўнікам і сябрам, а Фёдар Іванавіч жартаўліва называў Цясевіча сваім сапернікам.

### Пашырэнне рэпертуару

Платон Цясевіч быў сапраўдным куміра расійскай публікі. Яго з захапленнем сустракалі аматары оперы ў Пецярбургу, Арэнбургу, Ашхабадзе, Пензе, Самаркандзе, Ташкенце, іншых гарадах. Але нават на вяршыні славы, валодаючы ад прыроды рэдкім голасам густога арганнага тэмбру, Цясевіч не пераставаў удасканальваць сваё майстэрства. Спяваючы на адной сцэне з такімі опернымі зоркамі, як Л. Собінаў, М. Кузняцова-Бенуа, А. Пазоўскі, Платон Іванавіч уважліва аналізаваў іх вопыт.

У Пецярбургу Цясевіч займаўся вакалам з выпускніцай Пецярбургскай кансерваторыі, спявачкай, педагогам Лізаветай Кузняцовай. Знакаміты вучань закахаўся ў сваю настаўніцу, зрабіў ёй прапанову і атрымаў згоду. Пазней у мужа і жонкі Цясевічаў нарадзіўся сын Уладзімір – будучы прафесар, член-карэспандэнт АН Украінскай ССР (1907–1983).

Вядомасць Платона Цясевіча мела ўсерасійскі маштаб. Антрэпрэнёр Кіеўскага гарадскога тэатра С. Барыкін прыкладаў шмат намаганняў, каб заключыць кантракт са славутым вакалістам. Кіеўская трупа лічылася трэцяй па значнасці пасля труп Марыінскага (Пецярбург) і Імператарскага Вялікага (Масква) тэатраў, Платон Іванавіч згадзіўся пастуціць у яе. Кантракт быў падпісаны ў 1907 г., прычым адразу на тры гады, што рабілася ў выключных выпадках нават у дачыненні да самых славутых спевакоў. У Кіеўскім тэатры Цясевіч спяваў шмат знакамітых партый: Барыса Гадунова («Барыс Гадуноў»), Варажскага госця («Садко»), Ватана («Валькірыя»), Галіцкага і князя Ігара («Князь Ігар»), Івана Сусаніна («Жыццё за цара»). Усе спектаклі, у якіх спяваў наш зямляк, мелі вялікі поспех. Газеты пісалі, што калі Цясевіч выконваў партыю Мефістофеля ў оперы А. Байто, то выканаўцы іншых ролей адыходзілі на другі план. Спявак станавіўся цэнтральнай фігурай на сцэне і скараў слухачоў сілай і выразнасцю свайго ўнікальнага голасу. Бясспрэчнай творчай удачай П. Цясевіча стала і партыя Качубея ў оперы П. Чайкоўскага «Мазепа». Музычныя крытыкі адзначалі моцнае ўздзеянне на аўдыторыю свабоднага, трапяткога, нібы асветленага, баса-кантантэ Цясевіча, які да ўсяго быў яшчэ і выдатным драматычным акцёрам [4, с. 17]. Абвостранае ўспрыманне Платонам Іванавічам свету музычных вобразаў, шчырасць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яркая вакальная экспрэсія рабілі выкананне ім розных па характары партый выключна самабытным, запамінальным.

Нягледзячы на неверагодную папулярнасць, П. Цясевіч карпатліва працаваў над кожнай роляй. Здаралася, ён лічыў неабходным з'ездзіць у Пецярбург, каб параіцца з дырыжорам Марыінскага тэатра М. Біхцерам, рэжысёрам А. Пятроўскім, спевакамі Ф. Шаляпіным і І. Алчэўскім, а працуючы над партыямі пэўных гістарычных персанажаў, нават кансультаваўся з вядомым гісторыкам М. Кастамаравым. Музыказнаўцы сцвярджаюць, што па характары гучання голас П. Цясевіча з'яўляўся рэдкім класічным узорам баса-кантантэ, дыяпазон якога выходзіў за межы дзвюх актаў: ад мі-бемоль вялікай актавы да барытанальных нот верхняга рэгістра. І вызначаўся гэты голас не толькі сваім хараством і высакародствам, але і глыбокай эмацыянальнасцю, унутраным напружаннем кожнага слова, кожнага гуку.

## Еўрапейская вядомасць

У 1912 г. артыст упершыню выязджае ў еўрапейскія краіны з сольнымі канцэртамі і прадстаўляе замежнаму гледачу вялікі рускі класічны рэпертуар. Выступленні гэтыя, паводле сведчанняў сучаснікаў, праходзілі з нязменным поспехам. Прызнанне, якое П. Цясевіч атрымаў у патрабавальнага заходнееўрапейскага слухача, у многім спрыяла таму, што ў 1915 г. спявак быў запрошаны ў Імператарскі Вялікі тэатр. Ён дэбютаваў у оперы А. Гулак-Арцямоўскага «Запарожац за Дунаем». Спеваку ўдалося стварыць яркі камедыйны вобраз казака Карася. Пазней гэтая партыя ўвойдзе ў асноўны рэпертуар Цясевіча. У наступным сезоне Платон Іванавіч выконваў партыю Малюты Скуратава ў оперы М. Рымскага-Корсакава «Царская нявеста». Гэта было сур'ёзнае выпрабаванне. У спектаклі ўдзельнічалі такія зоркі опернай сцэны, як А. Няжданава, Л. Саўранскі, М. Куржыямскі, К. Антараў, Н. Каліноўская. Платону Іванавічу ўдалося стварыць каларытны вобраз гэтага адмоўнага персанажа. Партыі, якія спяваў П. Цясевіч на сцэне Імператарскага Вялікага тэатра, прынеслі яму сапраўдную славу.

Быў Платон Іванавіч і тонкім майстрам канцэртнага выканання вакальных твораў, кожны нумар спявак глыбока прадумваў і дэталёва адпрацоўваў. Яго камернае мастацтва грунтавалася на беражлівым, чуйным стаўленні да фактуры твора, на дзівосным уменні выявіць псіхалагічную афарбоўку інтанацыі, перадаць музычны падтэкст.

## У савецкі час

У савецкі час Платон Іванавіч далучаецца да справы папулярызацыі класічнага музычнага мастацтва сярод шырокіх народных мас. Паралельна з працай у тэатры ён гастраліруе па рэспубліках СССР, неаднаразова выступае перад рабочымі, чырвонаармейцамі, калгаснікамі і ў роднай Беларусі (Віцебск, Магілёў, Мінск, Орша). На сваіх канцэртах Цясевіч выконваў не толькі арыі з вядомых опер, але і беларускія, рускія, украінскія народныя песні.

У 1933 г. славуты спявак пакідае оперную сцэну, але працягвае ездзіць з гастролямі па ўсёй краіне. А ў лютым 1948 г. у вялікай канцэртнай зале маскоўскай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага адбыўся развітальны канцэрт шасцідзесяцігадовага майстра.

Пакінуўшы сцэну, П. І. Цясевіч працягваў пільна сачыць за тэатральным і музычным жыццём, бескарысліва перадаваў сваё майстэрства маладым артыстам.

Зорка таленавітага спевака, вячэрняга жаваранка, як называлі Платона Іванавіча музычныя крытыкі, згасла летам 1958 г. Пахаваны ён на Новадзявочых могілках у Маскве. І сёння на яго магіле час ад часу з'яўляюцца жывыя кветкі – знак прызнання вялікага ўкладу П. І. Цясевіча ў скарбонку сусветнага opернага мастацтва.

Імя нашага славутага суайчынніка занесена ў гістарычна-дакументальную кнігу «Памяць» Навагрудскага раёна, артыкулы аб яго творчасці пісалі беларускія навукоўцы І. Лысенка і У. Яфрэмаў. Але думаецца, гэты выдатны творца заслугоўвае большага ўшанавання з боку землякоў. Скажам, у вёсцы Нягневічы, дзе ён нарадзіўся, можна было б устанавіць памятны знак у гонар народнага артыста, а ў Навагрудку ці нават у Мінску назваць яго імем адну з вуліц.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Адлер, А.** Очерки по индивидуальной психологии / А. Адлер. – М.: Когито-центр, 2002. – 219 с.
2. **Ефремов, В.** С Шаляпиным рядом / В. Ефремов // Нёман. – 1975. – № 2. – С. 159–164.
3. **Лысенка, І.** Ураджэнец Навагрудчыны – славуты бас Расіі / І. Лысенка // Мастацтва Беларусі. – 1983. – № 9. – С. 44–48.
4. **Яфрэмаў, У.** Беларус Цясевіч / У. Яфрэмаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – 56 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ